Падтрымай "Вясну" на PATREON

Журналіст Андрэй Толчын аштрафаваны на 25 базавых

30.11.2017 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода слова



Журналіст Андрэй Толчын. Фота з сайта baj.by

Суд Чыгуначнага раёна Гомеля 30 лістапада аштрафаваў журналіста-фрылансера Андрэя Толчына на 25 базавых велічыняў (575 рублёў) за сюжэт на «Белсаце», які называўся: "40 градусаў, пагрозы і вада з туалета. Працаўнікі гомельскага "Каштану" пра невыносныя ўмовы". Пра гэты паведаміла "Беларуская асацыяцыя журналістаў".

Напярэдадні суддзя Чыгуначнага райсуда **Яўген Шаршнёў** за гэты ж самы сюжэт аштрафаваў на 690 рублёў гомельскага незалежнага журналіста **Кастуся Жукоўскага**, прызнаўшы яго вінаватым ў вырабе і распаўсюдзе сюжэту для польскага тэлеканала "Белсат" без акрэдытацыі ў беларускім МЗС.

Андрэй Толчын, у сваю чаргу, патлумачыў, што 3 кастрычніка быў каля прадпрыемства “Каштан”, каб абараняць Жукоўскага ад “непісьменных міліцыянтаў, неадэкватных асобаў, якія, бывае, кідаюцца на журналіста з відэакамэрай”. А яшчэ – трымаў мікрафон і вёў перамовы з нарадам міліцыі, што прыехаў да прахадной прадпрыемства па выкліку ахоўнікаў.

> *“На відэа бачна, што вы стаіце з мікрафонам побач з маладым чалавекам. Вы бралі ўдзел у апытанні?”* – пацікавіўся суддзя Шаршнёў у Андрэя Толчына.
>
> *“Я трымаў мікрафон, але пытанняў не задаваў,* – адказаў Толчын. – *Я гутарыў толькі з міліцыянтамі, тлумачыў, што відэаздымкі робяцца ў грамадскім месцы – Канстытуцыяй гэта не забараняецца. Куды і якім чынам адпраўляліся відэаздымкі, я не ведаю. Я гэтым не займаюся. У мяне няма працоўных дамоваў з аніякімі СМІ – ні з беларускімі, ні з замежнымі”.*

Кастусь Жукоўскі, які выступіў сведкам у адміністрацыйнай справе Толчына, пацвердзіў, што той толькі трымаў мікрафон, пытанняў мінакам не задаваў, відэаздымкаў не меў, таму і не мог іх нікуды даслаць.

У выніку суддзя Шаршнёў, які разглядаў адміністрацыйны пратакол, складзены міліцыяй у дачыненні Толчына, прыйшоў да высновы, што пацвярджэнняў распаўсюду відэаздымкаў няма. Ёсць толькі выраб прадукцыі СМІ без акрэдытацыі – Толчын трымаў мікрафон. Адсюль і штраф у 25 базавых велічыняў – на пяць меншы, чым ў Жукоўскага.

> *“Міліцыя не высвятляе першапачаткова, ці з’яўляюцца фрылансеры супрацоўнікамі таго ж “Белсата”. Адразу вінаваціць, што фрылансеры вырабілі відэасюжэт без акрэдытацыі, якой яны не маюць і ніколі мець не будуць. Суды гэтая акалічнасць таксама не надта цікавіць. Далі штраф – папоўнілі бюджэт. А што там на тым прадпрыемстве, чаго людзі абураюцца – гэта ўжо мала каго цікавіць”,* – сказаў пасля агалошвання пастановы суда Андрэй Толчын.

Сёлета гэта ўжо пяты штраф фрылансера Толчына паводле часткі 2 артыкула 22.9 КаАП. Агулам сума штрафаў склала 3795 рублёў.

Твитнуть





СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

